графической деятельности не входит в круг рассматриваемых в статье вопросов.

Внимательный читатель, несомненно, отметил наличие в схеме области, обозначенной как ноосфера. Она понимается нами как область мыслимого, что в традиционной философской интерпретации обозначается термином «идеальное», в отличие от имеющегося, т. е. «материального». Нельзя не упомянуть о важности и актуальности в этой связи разработок информационного общения. Как видно из схемы, именно ноосфера, субъективная составляющая библиотечно-библиографической деятельности, включающая и информационное общение в качестве одной из организационных форм, коренным образом влияет и определяет эффективность как этапов, так и уровней всей деятельности.

Необходимо разрабатывать философию и методологические основы библиотечно-библиографической деятельности постольку, поскольку она есть составляющая информационной деятельности человека. В условиях информатизации общества и возможного перехода к информационному типу общества задача теоретического осмысления основного вида деятельности позволяет выявить качественные особенности нового типа общества, тенденции и направления его развития, что в совокупности определяет место каждого человека, его роль в общественных отношениях.

Summary

The important problem connected with deficiency of full-bodied theoretical philosophical conception of library and bibliographic activities currently is considered. The 4-element-conception of library as social institution with its merits and demerits is used for example. Author"s own scheme illustrating theoretical basis of library and bibliographic activities is proposed. Possible merits and demerits of this scheme are examined in details. Special attention is attracted to urgency and importance of information relations research in connection with their role in the theory and practice of library and bibliographic activities.



Інтэрв'ю з дэканам факультэта інфармацыйна-дакументных камунікацый БДУ культуры ***Яцэвічам Мікалаем Аляксандравічам*** правялі Людміла Кірухіна і члены навуковага студэнцкага аб'яднання «Бібліяном» А. Астапчык, К. Лобан, С. Майсейшын, Г. Купрыянчык і інш.

# Крокі ў будучыню

*Мікалай Аляксандравіч, у гэтым годзе спаўняецца 60 гадоў вышэйшай бібліятэчнай адукацыі на Беларусі. Якія асноўныя этапы яна прайшла?*

– Вышэйшая бібліятэчная адукацыя ў нашай краіне бярэ свой пачатак са стварэння ў 1944 г. (пастанова СНК БССР ад 29 ліпеня 1944 г.) у складзе Мінскага педагагічнага інстытута бібліятэчнага факультэта, а 1 кастрычніка 1944 г. на факультэце ўжо пачаліся заняткі з першымі 30 студэнтамі. Гісторыкі бібліятэчнай справы лічаць апошнюю дату пачаткам вышэйшай бібліятэчнай адукацыі на Беларусі. Факультэт змяняў сваю назву – «бібліятэказнаўства і бібліяграфіі», «бібліятэчна-інфармацыйных сістэм». Атрымалася так, што сёння мы рыхтуемся да 60-гадовага юбілею факультэта інфармацыйна-дакументных камунікацый (ФІДК), асноўнай спецыяльнасцю на якім з'яўляецца «бібліятэказнаўства і бібліяграфія». Яна з'яўляецца факультэтаўтвараючай.

Увогуле, можна гаварыць пра наступныя асноўныя этапы ў развіцці вышэйшай бібліятэчнай адукацыі і адпаведна факультэта, паколькі ён адзіны ў Беларусі. Гэта: узнікненне, станаўленне, пераход да універсітэцкай падрыхтоўкі, рэфармаванне.

*Як факультэт рыхтуецца да юбілею ?*

– Разам з Беларускай бібліятэчнай асацыяцыяй створаны арганізацыйны камітэт. Рыхтуецца комплекс мерапрыемстваў. Сярод найбольш значных: выданне даведніка аб факультэце (яго гісторыі, гісторыі кафедраў, выкладчыках, сучасным стане); сустрэча 15 верасня (у Дзень бібліятэк) з выпускнікамі



бібліятэчнага факультэта ўсіх гадоў выпуску; правядзенне з 4 па 8 верасня міжнароднай навуковай канферэнцыі «Бібліятэкі і музеі ў адзінай прасторы інфармацыі і культуры». Сардэчна запрашаем!

*Ад сябе дадам, што будуць яшчэ матэрыялы і ў «Бібліятэчным свеце». Што ж, асноўныя юбілейныя мерапрыемствы яшчэ наперадзе. Давайце цяпер засяродзім увагу на сённяшнім жыцці факультэта. За апошні год тут адбылося шмат перамен. Самая яскравая – змяненне назвы. Знікла слова «бібліятэчны». Ці азначае гэта змяненне вектара падрыхтоўкі кадраў?*

– У красавіку 2003 г. адбылася рэарганізацыя БДУ культуры. Гэта стала неабходным таму, што за апошнія дзесяць гадоў у ім значна павялічылася колькасць спецыяльнасцей і спецыялізацый, змяніліся іх назвы, накірункі, змест адукацыі. Было распрацавана першае пакаленне універсітэцкіх адукацыйных стандартаў. Узнікла неабходнасць пераразмеркавання спецыяльнасцей і спецыялізацый на факультэтах у адпаведнасці з «Агульнадзяржаўным класіфікатарам Рэспублікі Беларусь. Спецыяльнасці і кваліфікацыі» (2002 г.), удакладнення назваў факультэтаў і кафедраў, зместу іх дзейнасці. Усё гэта датычылася і факультэта бібліятэчна-інфармацыйных сістэм, на якім ужо вялася падрыхтоўка спецыялістаў не толькі па спецыяльнасці «бібліятэказнаўства і бібліяграфія», але і па «музейнай справе і ахове гісторыка-культур-

най спадчыны», а таксама па здвоенай спецыяльнасці «бібліятэказнаўства і бібліяграфія, беларуская мова і літаратура». Акрамя гэтага, у названым класіфікатары па нашых прапановах былі зацверджаны новыя накірункі спецыяльнасці «бібліятэказнаўства і бібліяграфія»: менеджмент, аўтаматызаваныя бібліятэчна-інфармацыйныя сістэмы (АБІС), інфармацыйнае забеспячэнне (па сферах), філалогія і лінгвістыка, кніжны гандаль. Названыя накірункі даюць магчымасць пашырыць на факультэце колькасць здвоеных спецыяльнасцей, якія зараз вельмі неабходны на рынку працы і павышаюць устойлівасць на ім маладога спецыяліста. У свеце ідзе актыўны працэс інтэграцыі спецыяльнасцей і кваліфікацый. Мы не павінны застацца ў баку ад яго. Цяпер можна прысвойваць новыя кваліфікацыі: «бібліятэкар-бібліёграф, менеджэр», «бібліятэкар-бібліёграф, спецыяліст па АБІС», «бібліятэкар-бібліёграф, выкладчык, перакладчык», «бібліятэкар-бібліёграф, спецыяліст па інфармацыі», «бібліятэкар-бібліёграф, тавpackагазнаўца».

Наконт перабудовы факультэта, змянення яго назвы і структуры было шмат думак і эмоцый. Сённяшняя назва факультэта (ФІДК) - гэта не толькі прывядзенне зместу яго дзейнасці да формы, а прэтэнзіі на падрыхтоўку спецыялістаў для іншых сацыяльных інстытутаў сістэмы інфармацыйна-дакументных камунікацый: разнастайных інфармацыйных службаў і аналітычных цэнтраў, кнігагандлёвых арганізацый, архіваў, выдавецтваў і інш.

***А якіх спецыялістаў яшчэ можна рыхтаваць на факультэце ?***

– Сёння для розных інфармацыйных службаў неабходны супрацоўнікі (аналітыкі), здольныя аналізаваць і перапрацоўваць інфармацыю. Такія спецыялісты карыстаюцца папулярнасцю на сучасным рынку працы, а адпаведныя прафесіі часта называюцца «прафесіямі XXI стагоддзя». Кадраў такога кшталту ў Беларусі не хапае. Трэба запаўняць гэтую нішу, пакуль яе не захапілі іншыя. Мы плануем ажыццявіць з 2005 г. набор па спецыяльнасці «Інфармацыя і камунікацыя» са спецыялізацыяй «менеджмент інфармацыйных рэсурсаў». Магчымы іншыя варыянты. Працуем у гэтым накірунку з адпаведнымі структурамі. Неабходна таксама прадоўжыць працу па здвоеных спецыяльнасцях. Пакуль рэальна на факультэце існуе адна такая спецыяльнасць «бібліятэказнаўства і бібліяграфія, беларуская мова і літаратура», выпускнікі якой размяркоўваюцца ў бібліятэкі і школы. Існуюць цікавыя прапановы па аб'яднанні бібліятэчнай спецыяльнасці з псіхалогіяй, сацыяльнай работай, прафесійным навучаннем, кнігараспаўсюджаннем і інш.

Адсутнасць слова «бібліятэчны» ў назве факультэта не павінна палохаць спецыялістаў бібліятэчнай справы. Спецыяльнасць «бібліятэказнаўства і бібліяграфія», як ужо адзначалася, застаецца асноўнай і павінна развівацца з улікам сусветных тэндэнцый. Па гэтай спецыяльнасці займаецца больш за 470 чалавек з 550 усіх студэнтаў факультэта. Як бачыце, і па колькасным складзе яна базавая. Але факультэт павінен рухацца ў тых накірунках, якія пазначаны вышэй. Ва універсітэтах далёкага і блізкага замежжа (дзе раней - дзе пазней), але назвы і змест работы бібліятэчных факультэтаў таксама змяняюцца ў бок пашырэння і інтэграцыі з іншымі спецыяльнасцямі інфармацыйна-дакументнай сферы.

***Раскажыце аб новай структуры факультэта. Наколькі яна прагрэсіўней за былую?***

– Стварэнне ФІДК адбывалася ў агульнай канцэпцыі рэарганізацыі структуры БДУ культуры. Згодна з гэтай канцэпцыяй па кожнай спецыяльнасці на факультэтах універсітэта створана вядучая тэарэтычная кафедра, якую ўзначальвае доктар навук. На ФІДК такімі кафедрамі з'яўляюцца: па спецыяльнасці «бібліятэказнаўства і бібліяграфія» – кафедра тэорыі і гісторыі інфармацыйна-дакументных камунікацый (заг. кафедры – докт. пед. навук, прафесар Лявончыкаў В.Я.), па спецыяльнасці «музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны» – кафедра гісторыі Беларусі і музеязнаўства (докт. гіст. навук., прафесар Грыцкевіч А.П.). Асноўнымі напрамкамі дзейнасці гэтых кафедраў з'яўляецца тэарэтычная распрацоўка адпаведных галін дзейнасці, выкладанне вучэбных дысцыплін і іх навукова-метадычнае забеспячэнне, павышэнне адказнасці за падрыхтоўку магістрантаў і аспірантаў. Былі створаны яшчэ дзве новыя спецыяльныя кафедры: інфармацыйных рэсурсаў (докт. філал. навук, прафесар Марозаў А.У.) і менеджменту інфармацыйна-дакументнай сферы (канд. пед. навук, дацэнт Зыгмантовіч С.В.). Адпаведна адбыліся змены і з кадравым складам. Усе выкладчыкі былі размеркаваны адпаведна дысцыплінам па профілю пэўнай кафедры. Дэканату ФІДК былі таксама падначалены кафедра беларускай філалогіі (заг. кафедры – канд. філал. навук, прафесар Гуліцкая В.А.), замежных моў (канд. філал. навук, дацэнт Падабедава Н.А.), якія па свайму статусу з'яўляюцца агульнауніверсітэцкімі, але маюць адпаведныя спецыялізацыі па спецыяльнасці «бібліятэказнаўства і бібліяграфія», а таксама кафедра сусветнай літаратуры (заг. кафедры – канд. філал. навук, дацэнт Булацкая Н.А.). Такім чынам, сёння на факультэце працуе сем кафедраў. У працэсе рэарганізацыі найбольшыя змены адбыліся на спецыяльных кафедрах, якія забяспечваюць бібліятэчную спецыяльнасць.

Наколькі прагрэсіўныя такія змены – пакажа час, але пад такія назвы кафедраў ёсць магчымасць адкрываць новыя спецыяльнасці, спецыялізацыі і адпаведна ўводзіць новыя дысцыпліны.

***У прафесійным друку шмат гаворыцца аб новай сістэме вышэйшай адукацыі ў Беларусі, у прыватнасці, аб пераходзе на двух-, трохступенчаты ўзровень. Наколькі хутка і эфектыўна яна будзе ўжыта на нашым факультэце?***

– Вы закранулі важную і складаную праблему, якая яшчэ канчаткова не вырашана на агульнадзяржаўным узроўні і не замацавана заканадаўча. Зараз Міністэрствам адукацыі і іншымі зацікаўленымі бакамі распрацоўваецца адпаведная нарматыўна-прававая база. Ставіцца задача падрыхтоўкі кадраў трох узроўняў: бакалаўр (чатыры гады), спецыяліст (пяць гадоў), магістр (шэсць гадоў). Не прэтэндуючы на паўнату і канчатковасць, можна так пракаменціраваць гэтыя ўзроўні ў дачыненні да спецыяльнасці «бібліятэказнаўства і бібліяграфія». Бакалаўр – гэта «сэрвіс-бібліятэкар» (даруйце за такое спалучэнне), які будзе арыентаваны на авалоданне ведамі, уменнямі і навыкамі па аказанні агульных бібліятэчна-інфармацыйных паслуг чытачам (карыстальнікам) бібліятэкі. Бакалаўрыят не будзе мець спецыялізацый. Выпускнік бакалаўрыята здае дзяржаўныя экзамены. Студэнт другога ўзроўню зможа засвоіць пэўную спецыялізацыю і атрымаць дадатковую кваліфікацыю, напрыклад, «бібліятэкар-бібліёграф, спецы-

яліст па АБІС», «бібліятэкар-бібліёграф, спецыяліст па інфармацыі» і г.д. Ён здае дзяржаўныя экзамены і абараняе дыпломную працу. На трэці ўзровень пераходзяць найбольш таленавітыя студэнты, якія з цягам часу далучацца да бібліятэчнай эліты. У сваім навучанні яны арыентаваны на навукова-даследчую, навукова-метадычную, навукова-педагагічную і ўпраўленчую дзейнасць. Магістрант рыхтуе і абараняе магістарскую дысертацыю. Магістры змогуць працаваць у якасці навуковых супрацоўнікаў буйнейшых бібліятэк, выкладчыкамі ў вышэйшых і сярэднеспецыяльных навучальных установах, узначальваць бібліятэчна-інфармацыйныя ўстановы ці быць кіраўнікамі іх структурных падраздзяленняў. Магістр таксама зможа адразу паступаць у аспірантуру. Пры пераходзе на вышэйшы ўзровень неабходна будзе рабіць кваліфікацыйны адбор, вызначыўшы папярэдне адпаведныя крытэрыі. Факультэт паступова працуе над шматузроўневай сістэмай, але пытанняў пакуль шмат. Напрыклад, дзе месца тых студэнтаў, якія будуць прыходзіць да нас пасля Магілёўскага бібліятэчнага тэхнікума (МБТ) і іншых сярэднеспецыяльных навучальных устаноў; як юрыдычна будуць замацаваны правы выпускнікоў розных узроўняў пры заняцці імі вакантных пасад і г. д.? Хуткасць ажыццяўлення такіх змен залежыць ад мноства фактараў, галоўным з якіх з'яўляецца прыняцце адпаведных рашэнняў на дзяржаўным узроўні. Наколькі гэта будзе эфектыўна ў нашых умовах? Зноў-жа пакажа час, але хачу падкрэсліць, што мы павінны стаць паўнапраўнымі ўдзельнікамі агульнаеўрапейскай адукацыйнай прасторы. Для гэтага нашы дыпломы павінны адпавядаць патрабаванням Лісабонскай канвенцыі 1997 г., да якой у 2002 г. далучылася Беларусь.

*Мікалай Аляксандравіч, як Вы думаеце, ці стане з цягам часу ў нашай краіне бібліятэчная адукацыя другой вышэйшай на базе асноўнай галіновай?*

– Ужо стала. У БДУ культуры створаны і вельмі актыўна развіваецца, прайшоў акрэдытацыю факультэт павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў. У мінулым годзе сярод яго першых выпускнікоў былі шэсць чалавек па бібліятэчнай спецыяльнасці (спецыялізацыя «АБІС») на базе поўнай вышэйшай. Гэта першы вопыт. Дадатковая адукацыя, вядома ж, платная. Але я разумею, што Вас цікавіць не толькі гэта, а ўвогуле, як лепш рыхтаваць спецыялістаў. Асноўны кантынгент паступаючых ва універсітэт – гэта выпускнікі школ з адпаведнай падрыхтоўкай. Таксама мы прымаем студэнтаў з Мінскага дзяржаўнага вучэбнага лінгвістычнага комплексу «гімназія - каледж» № 24 і МБТ, з якімі даўно і цесна супрацоўнічаем. Зараз факультэт робіць намаганні, каб ператварыць МБТ у вышэйшы бібліятэчна-інфармацыйны каледж, што дасць магчымасць усім яго выпускнікам паступаць да нас адразу на трэці курс. Зараз такімі «прывілеямі» карыстаюцца толькі навучэнцы спецгрупы тэхнікума. Іх няшмат, 15 чалавек у год.

*А аб чым сведчыць замежны вопыт?*

– Калі гаварыць пра замежны вопыт, у першую чаргу эканамічна развітых краін свету, то там бібліятэкараў таксама рыхтуюць па-рознаму, але ў асноўным на базе пэўнай адукацыі. Вы можаце мець, напрыклад, тэхнічную адукацыю, потым вучыцца два гады і атрымаць яшчэ магістэрскую ступень па бібліятэказнаўству. Напрыклад, у Каліфарнійскім універсітэце, дзе нам з Вамі, Людміла Генадзьеўна, удалося пабываць, рыхтуюць магістраў (звычайна два гады) на базе ўжо нейкай спецыяльнасці. Такі спецыяліст ведае сваю прадметную вобласць і бібліятэчна-інфармацыйную дзейнасць. Ён можа ствараць прынцыпова новыя інфармацыйныя прадукты, выступаць у якасці эксперта, быць менеджэрам-аналітыкам інфармацыйных рэсурсаў. Мы рыхтуем спецыялістаў для метаўзроўню (у галіне другаснай інфармацыі), але задача ўжо сённяшняга дня – уменне працаваць з «уласна» інфармацыяй з выкарыстаннем метадаў інфармацыйнага аналізу і сінтэзу. Як я ўжо адзначаў, такія спецыялісты вельмі неабходны. Праблема вельмі яскрава праявілася ў сувязі з новымі задачамі Нацыянальнай бібліятэкі. Ёй і іншым бібліятэкам цяпер патрэбны не толькі бібліятэчныя работнікі, але і праграмісты, сістэмныя аналітыкі, адміністратары баз даных і сетак, інжынеры, псіхолагі, перакладчыкі і г.д. Такія спецыялісты ёсць на рынку працы. Яны могуць мець добрую базавую падрыхтоўку, але ім не хапае адукацыі ў галіне бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці. Запрашаем іх у вочную (завочную) магістратуру на ФІДК. Вельмі цікавай, але і складанай па вырашэнні, з'яўляецца ідэя аб інтэграваным навучанні адразу ў двух універсітэтах. Напрыклад, абітурыент паступіў у БДУ культуры на нашу спецыяльнасць, а скончыў, напрыклад, БДУІР, факультэт аўтаматызаваных інфармацыйных сістэм. Гэты спецыяліст быў бы «нарасхват» у сучасных бібліятэках. Зразумела, што для гэтага трэба ўвесці новыя пасады ў бібліятэках, вызначыць больш-менш прыстойныя аклады. Над апошнім, наколькі я ведаю, зараз актыўна працуе НББ.

*Вы закранулі Нацыянальную бібліятэку. Скажыце, як факультэт будзе забяспечваць яе кадрамі, калі ёй патрэбны на працягу некалькіх гадоў каля пяцісот бібліятэкараў. Чым яе новыя супрацоўнікі павінны адрозніваца ад сённяшніх маладых спецыялістаў?*

– Будаўніцтва новай Нацыянальнай бібліятэкі – справа адметная. Не кожная краіна можа пахваліцца гэтым. Я лічу, што НББ – гэта своеасаблівы лакаматыў, які можа пацягнуць за сабой развіццё ўсёй бібліятэчнай інфраструктуры краіны. Пад эгідай такой увагі да НББ трэба карыстацца момантам усім нам. Новы будынак НББ, як вядома, павінен стаць «інтэлектуальным», дзе ўсім будзе запраўляць аўтаматыка: асвятленнем, ацяпленнем, кандыцыяніраваннем паветра і г.д. Бібліятэка будзе ўкараняць сучасную аўтаматызаваную бібліятэчную сістэму. Патрэбны адпаведныя маладыя кадры. Пытанне не засталося па-за ўвагай Міністэрства культуры і універсітэта. Паміж НББ і БДУ культуры была заключана адпаведная дамова. З 2003 г. на I курс ФІДК набрана першая спецыяльная група для НББ у колькасці 10 чалавек, у 2004 г. набор павялічыцца да 25 чалавек. Да конкурсу дапускаюцца толькі тыя, хто мае мінскую гарадскую ці раённую прапіску, што выклікала незадаволенасць у шэрага абітурыентаў і іх бацькоў, але гэта тэма для асобнай размовы. У адпаведнасці з рашэннем калегіі Міністэрства культуры РБ «Аб першачарговых мерах па падрыхтоўцы да работы ў новым будынку Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі» ад 26.02.04 г. на ФІДК таксама ўскладзена задача па фарміраванні «з ліку студэнтаў старэйшых курсаў спецыялізаваных груп для навучання, праходжання вытворчай практыкі і падрыхтоўкі дыпломных праектаў па перспектыўных накірунках дзейнасці НББ». Зараз мы ствараем

адпаведныя групы. Змест дысцыплін спецыялізацыі ў іх павінен быць максімальна набліжаным да асаблівасцей НББ. Студэнты будуць больш паглыблена вывучаць інфармацыйныя рэсурсы нацыянальных бібліятэк, арганізацыю і тэхналогію іх работы, кіраванне нацыянальнай бібліятэкай у цэлым і яе бібліятэчнымі працэсамі, асаблівасці метадычнай дзейнасці і г.д. Асноўная ўвага будзе надавацца аўтаматызаваным бібліятэчна-інфармацыйным тэхналогіям, уменням і навыкам фарміраваць, ствараць і выкарыстоўваць інфармацыйныя рэсурсы з дапамогай сучасных карпаратыўных і глабальных камп'ютэрных сетак. Невыпадкова, што спецгрупы набіраюцца на спецыялізацыю «АБІС». Неабходнай умовай падрыхтоўкі высокакваліфікаваных кадраў для НББ, як і для ўсіх бібліятэк, з'яўляецца стварэнне на факультэце сучаснага праграмна-тэхнічнага комплексу.

Зразумела, што пры размеркаванні маладых спецыялістаў у гэтым і наступных гадах прыярытэт будзе аддадзены НББ. Размяркоўвацца ў яе будуць лепшыя студэнты з мінскай (раённай) прапіскай. Факультэт не зможа адразу задаволіць усе патрэбы бібліятэкі. Набор на бібліятэчную спецыяльнасць, напрыклад, на наступны год складае 125 чалавек. Калі сапраўды будзе пабудавана менавіта такая «нацыяналка», як адлюстравана ў праектнай дакументацыі, і калі ў ёй будзе прыстойная заработная плата, то праблема з кадрамі вырашыцца дастаткова хутка. А нашы маладыя спецыялісты (як і ўсе іншыя) будуць уладкоўвацца ў галоўную бібліятэку краіны па конкурсу. Памарым аб гэтым.

*Мікалай Аляксандравіч, Вы падкрэслілі значнасць праграмна-тэхнічнага комплексу ў навучанні студэнтаў. Раскажыце, калі ласка, якое становішча ў гэтым накірунку на факультэце.*

– Ёсць такая праблема ў нашым універсітэце. Дарэчы, яна ёсць ва ўсіх універсітэтах культуры краін СНД, якія фінансуюцца з бюджэту міністэрстваў культуры, а фінансаванне жадае быць лепшым. Акрамя таго, тыя грашовыя сродкі, якія маюць універсітэты, размяркоўваюцца часта не на карысць бібліятэчных факультэтаў. Іміджам універсітэтаў культуры з'яўляецца не інфарматызацыя, а наяўнасць творчых калектываў самых розных накірункаў. Такая аб'ектыўная рэальнасць. Але гэта не здымае праблему, якая, дарэчы, з'яўляецца сістэмнай. У БДУ культуры ў апошні час робяцца значныя крокі ў бок інфарматызацыі. Працуюць чатыры камп'ютэрныя класы, якія, праўда, вельмі перагружаны, частка апаратных сродкаў маральна састарэла, няма хуткаснага і надзейнага выхаду ў Інтэрнет па оптавалаконных лініях сувязі. Палепшыць сітуацыю павінен інфармацыйны цэнтр універсітэта вучэбна-вытворчага прызначэння (створаны ў пачатку бягучага года) з 20 рабочымі станцыямі, які цяпер актыўна абсталёўваецца. З верасня бягучага года факультэт плануе яго актыўна выкарыстоўваць. На самім факультэце існуючая камп'ютэрная лабараторыя мае вельмі абмежаваную колькасць камп'ютэраў з ненадзейным выхадам у Інтэрнет. Не ўсе кафедры факультэта маюць камп'ютэр і адпаведныя прылады. У апошні час мы актыўна працуем над паляпшэннем сітуацыі. Лабіруем свае інтарэсы не толькі ва універсітэце, але і міністэрстве. Так, у рашэнні Калегіі МК «Аб стане і перспектывах аўтаматызацыі бібліятэк» БДУкультуры было рэкамендавана падрыхтаваць заяўку на грант фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы культуры і мастацтва з мэтай стварэння на ФІДК камп'ютэрнай лабараторыі. Наша заяўка знаходзіцца на разглядзе ў названым фондзе.

*А як самі выкладчыкі, асабліва старэйшага пакалення, укараняюць інфармацыйныя тэхналогіі ў працэс навучання ?*

– Я ўжо казаў, што выкарыстанне камп'ютэрных тэхналогій – гэта справа сістэмная. Не заўсёды ўсё толькі зводзіцца да наяўнасці камп'ютэрных лабараторый. На факультэце існуе праблема паступовай і разумнай змены старэйшага пакалення выкладчыкаў. Факультэт старэе. І, нягледзячы на тое, што ў апошнія гады на кафедры прыйшлі маладыя выпускнікі аспірантуры, праблема застаецца дастаткова вострай. Больш таго, шэраг нашых маладых высокакваліфікаваных выкладчыкаў з навуковымі ступенямі і званнямі пачынае, прабачце, «пераходпліваць» тая ж НББ. Канкурэнцыя, што зробіш. Дык вось, многімі выкладчыкамі не выкарыстоўваюцца ці недастаткова выкарыстоўваюцца тыя магчымасці камп'ютэрных лабараторый, якія ёсць ва універсітэце. Змяніць такую сітуацыю ў лепшы бок – адна з асноўных задач спецыяльных кафедраў і, зразумела, дэкана факультэта. Неабходна адзначыць, што для правядзення занят каў у аўтаматызаваным рэжыме мы



актыўна выкарыстоўваем магчымасці іншых універсітэтаў, а таксама бібліятэк. Напрыклад, у БДПУ ўжо шмат гадоў праводзяцца лабараторныя заняткі па курсу «Тэхнічныя сродкі бібліятэчнай работы». БелСХБ, ФБ БДУ, РНТБ, РНМБ, Прэзідэнцкая бібліятэка, НББ, ЦНБ НАН, Мінская абласная бібліятэка і іншыя – нашы надзейныя і добрыя партнёры. Карыстаючыся момантам, хачу падзякаваць ім за гэта. Мы робім адну і тую ж справу.

*А якія АБІС вывучаюць студэнты факультэта?*

– Дзякую за важнае пытанне. Часта ад спецыялістаў-практыкаў можна пачуць, што на факультэце павінны быць у наяўнасці ўсе пакеты прыкладных праграм (ППП), якія выкарыстоўваюцца ў бібліятэках Беларусі (а іх звыш 12-ці). Было б цудоўна, але немагчыма па фінансавых праблемах. Больш таго, і непатрэбна па наступных прычынах. Па-першае, большасць з выкарыстоўваемых у нас АБІС з'яўляюцца недасканалымі, а вывучаць трэба лепшыя ўзоры. Па-другое, калі студэнт добра засвоіў тэхналогію хаця б адной сучаснай (якаснай) АБІС, набыў адпаведныя ўменні і навыкі, то ў бібліятэцы ён зможа лёгка і хутка засвоіць асаблівасці іншай сістэмы і паспяхова працаваць у ёй. Усе аўтаматызаваныя сістэмы будуюцца па агульных прынцыпах: ідэнтычнасці, пераймальнасці, інтэраперабельнасці (здольнасці да ўзаемадзеяння з іншымі сістэмамі) і інш. Адрозніваюцца яны толькі функцыянальнымі магчымасцямі і карыстальніцкім інтэрфейсам. На факультэце ў наяўнасці рабочыя версіі АБІС «А-ЭЛІТА» падмаскоўнага ЗАТ «ГИПЕР» і «ALIS» беларускага НВА «ИНЕАК». Таксама выкарыстоўваюцца дэма-версіі АБІС «ИРБИС» (ДПНТБ Расіі) і «MARC-SQL» (НВА «Иформсистема», Масква), у межах якіх можна ствараць невялікія вучэбныя базы даных. Мы плануем пры з'яўленні першай фінансавай магчымасці набыць рабочую версію адной з гэтых сістэм. Выкарыстоўваюцца і іншыя спецыялізаваныя ППП, напрыклад: «Эталонны банк даных прававой інфармацыі» НЦПІ, «Дыялог» ВИНИТИ (для стварэння фактаграфічных

БД); «Зводны электронны каталог» ДПНТБ і інш. У спецгрупе студэнтаў для Нацыянальнай бібліятэкі неабходна вывучаць АБІС «NATLIS», пакуль бібліятэкай не будзе набыта новая сістэма.

*Што яшчэ адметнага адбылося на факультэце ў апошні час?*

– Думаю, што пераход на дзесяцібальную сістэму ацэнкі ведаў студэнтаў, на якую мы перайшлі паступова з І курса ў кастрычніку 2003 г. Існуюць розныя погляды на неабходнасці гэтай сістэмы. Некаторыя яе не ўспрымаюць і кажуць, што гэта – чарговая даніна Захаду. На мой погляд, гэтая сістэма дазваляе больш дакладна ацаніць веды студэнтаў. Асабліва гэта датычыцца экзаменаў. Перад выкладчыкам раней стаяла цяжкая праблема выбару, якую адзнаку паставіць, калі, напрыклад, студэнт адказваў больш, чым на «4», але менш, чым на «5». Цяпер у гэтай зоне ёсць адзнакі 7, 8, 9. Адзнака 10 балаў – гэта «вышэйшы пілатаж». Яна выстаўляецца, калі студэнт прадэманстраваў бліскучыя веды па ўсіх пытаннях, бездакорна выканаў экзаменацыйныя заданні, выкарыстаў пры гэтым нестандартныя прыёмы і метады; паказаў высокую эрудыцыю, талент, творчыя здольнасці, высокі ўзровень абагульненняў; праявіў уменні пераносу ведаў у незнаёмую, нестандартную сітуацыю. Студэнтаў з 10 баламі на факультэце будуць адзінкі. Каб сярод студэнтаў і выкладчыкаў не было хваляванняў і непаразуменняў, мы папярэдне распрацавалі адпаведныя крытэрыі ацэнкі ведаў студэнтаў па дзесяцібальнай сістэме, выдалі адпаведныя метадычныя рэкамендацыі па цыклах дысцыплін, якія выкладаюцца на факультэце на ўсіх 5-ці курсах.

*А які працэнт паспяховасці студэнтаў?*

– Пасля апошняй зімовай экзаменацыйнай сесіі ён склаў 78 працэнтаў і з'явіўся самым нізкім ва універсітэце, зразумела, не ўлічваючы студэнтаў-завочнікаў. Але не спяшайцеся расчароўвацца. Гэта высокі, аб'ектыўны працэнт. За шмат гадоў на нашым факультэце склаўся вельмі прынцыповы падыход да ацэнкі ведаў студэнтаў, нават, часам, і занадта. Увогуле, студэнты факультэта ў асноўнай сваёй частцы грунтоўна падрыхтаваныя маладыя людзі, як па блоку сацыяльна-гуманітарных, так і спецыяльных дысцыплін. Чаго б я хацеў пажадаць ім, гэта большай разняволенасці, свабоды ў сваіх думках і меркаваннях, творчага падыходу да навучання.

*А чаго б Вы пажадалі выкладчыкам?*

– І сабе і выкладчыкам – таго ж самага, што і студэнтам, а таксама пазбавіцца ад пэўных поглядаў і меркаванняў, ад якіх, прабачце, патыхае нафталінам.

*Напэўна, у Вас ёсць мары, звязаныя з прафесійнай дзейнасцю.*

– Думаю, што мары ў мяне такія самыя, як і ў маіх калег. Яны звязаны з тым, каб усе «здымалі капялюш» пры словах бібліятэка, бібліятэкар. Каб наша прафесія была паважанай і добра аплачваемай. Гэта зямная мара ўсіх бібліятэчных работнікаў. Ніколі не забудуся, як некалі ў Вашынгтоне да мяне падыйшоў чалавек, проста прахожы, які, убачыўшы мой бэйджык з надпісам «Амерыканская бібліятэчная асацыяцыя», паціснуў мне руку і падняў уверх вялікі палец. Гэта мяне ўразіла. Каб так у нас. Хацелася б таксама, каб мы на факультэце яшчэ больш грунтоўна рыхтавалі студэнтаў, асабліва ў галіне інфармацыйных тэхналогій; каб факультэт і яго выкладчыкі-навукоўцы былі вядомымі па ўсёй Беларусі і далёка за яе межамі. Вось такія мае «сціплыя» мары. Для іх ажыццяўлення мы павінны шмат чаго зрабіць. У апошні час у Беларусі шмат і робіцца. І само будаўніцтва Нацыянальнай бібліятэкі – гэта стварэнне іміджу бібліятэчнай справы. Бібліятэчныя праблемы лабіруюцца ў структурах дзяржаўнай улады. Бібліятэчная тэматыка актыўна ўварвалася на тэлебачанне, радыё, друкаваныя сродкі масавай інфармацыі, праводзіцца мноства цікавых мерапрыемстваў. Мы таксама не застаёмся ў баку ад гэтай справы.

*Пагаворым аб спрадвечным. Чым дэкан факультэта інфармацыйна-дакументных камунікацый любіць займацца ў вольны ад працы час?*

– Праца ў дэкана не простая, але цікавая. Дэкан адказвае на факультэце за ўсё, таму часу на свае захапленні застаецца мала. У мяне два сыны. Малодшаму толькі трынаццаць гадоў, яго трэба выхоўваць. Ён – і мой вольны час, і мае захапленні, і мае праблемы. Старэйшы – ужо дарослы, жанаты. Часта бываю ў вёсцы, дзе жывуць мае старэнькія бацькі, якім трэба дапамагаць. Адпачываю разам з сям'ёй. Мы ўсе апантаныя лесам. Апошнія гады адпачывалі таксама ў Крыме. Люблю пачытаць добрую, пажадана гістарычную, кнігу, не ўяўляю сябе без штодзённай газеты і навін па тэлебачанні. Улетку разам з сынам бегаем з мячом. Люблю паглядзець добры футбол. Вось такія звычайныя захапленні звычайнага чалавека.

*Якую кнігу Вы зараз чытаеце?*

– У апошні час стараюся чытаць беларускую класіку. Адчуў, што сёння гэта проста неабходна. Цяпер перачытваю «Знак бяды» В. Быкава.

*Ці лічыце Вы сябе шчаслівым чалавекам?*

– Каб ведаць дакладна, што такое шчасце. У кожнага яно сваё. Паспрабую раскрыць сваю формулу шчасця. Я шчаслівы, што займаюся любімай справай – адукацыяй і выхаваннем маладых людзей. Я люблю студэнтаў. Усё маё жыццё звязана з бібліятэкай, падрыхтоўкай кадраў – з 1972 г, калі я стаў навучэнцам Магілёўскага бібліятэчнага тэхнікума. У маёй працоўнай кніжцы са студэнцкіх часоў адзіны запіс – Мінскі інстытут культуры (цяпер БДУкультуры), яго бібліятэка, яго кафедры, яго дэканат. Выключэнне, хіба што, – час навучання ў аспірантуры на кафедры інфарматыкі і тэхнічных сродкаў Ленінградскага дзяржаўнага інстытута культуры. Ды і там я быў па мэтавым накіраванні. Я шчаслівы, што маімі настаўнікамі былі і ёсць такія вядомыя людзі, як А.В.Сакалоў, В.П.Лявонаў, В.М.Матылёў, Д.І.Блюменаў, В.А.Мінкіна, В.Е.Лявончыкаў, Р.А.Ровіна, І.А.Прылішч і шмат іншых. Я шчаслівы, што ў мяне ёсць сям'я, што жывыя мае бацькі, што ў мяне ёсць сябры, што ў мяне ёсць Беларусь.

*Мікалай Аляксандравіч, дзякую вялікае за інтэрв'ю, за шчырыя адказы. Дазвольце мне ад імя шматлікіх чытачоў «Бібліятэчнага свету» пажадаць Вам і вашым калегам моцнага здароўя, плёну, творчага натхнення, здзяйснення задуманага і квітнення ФІДК.*

– Таго ж самага і Вам, а таксама ўсім чытачам часопіса «Бібліятэчны свет». Дзякую.

Summary

Interview with the dean of the information and documentary communication faculty M. Yatsevich reveals problems of the training future librarians at the Belarus Culture University.